**СПЛЯЦЕННЕ ТВОРЧАСЦІ – СПЛЯЦЕННЕ КУЛЬТУР**
Пра канцэрт, прысвечаны візіту кітайскай дэлегацыі
Стар. 3

**ІНА ГУЛІС: УСЮДЫ, ДЗЕ ЁСЦЬ СІСТЭМА «ЧАЛАВЕК – ЧАЛАВЕК», ЁСЦЬ МЕСЦА ДЛЯ ПРАЦЫ ПСІХОЛАГА**
Гісторыя педагога з амаль што 20-гадовым стажам
Стар. 4

**АЛЯКСЕЙ БАКАВЕЦ: АД НАВУКІ ДА ВЫКЛАДАННЯ**
Пра выкладчыка і яго падыходы да студэнтаў
Стар. 5

**АЛЯКСЕЙ ФУРСА: АД ЧЭМПІЁНАЎ БЕЛАРУСІ ДА ПРАДСТАЎНІКОЎ ЗАМЕЖНЫХ ЧЭМПІЯНАТАЎ**
Пра развіццё футбола ў БДУ
Стар. 6

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

24 ліпеня 2024 года, № 7 (2285)

## НОВЫЯ ДАМОЎЛЕНАСЦІ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ ДАСЯГНУТЫ ПАМІЖ БДУ І ПЕКІНСКІМ УНІВЕРСІТЭТАМ У МЕЖАХ ФОРУМУ РЭКТАРАЎ УНІВЕРСІТЭТАЎ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ



Новыя дамоўленасці аб супрацоўніцтве дасягнуты паміж БДУ і Пекінскім універсітэтам (ПКУ) у межах **Форуму рэктараў УВА Беларусі і Кітая.** Урачыстае мерапрыемства адбылося 26 чэрвеня ў Мінску. Маштабная падзея арганізавана сумесна БДУ і Пекінскім універсітэтам з запрашэннем рэктараў з больш як 40 універсітэтаў дзвюх краін. Адпаведныя подпісы пад трыма дакументамі паставілі сакратар партыйнага камітэта Пекінскага ўніверсітэта Хаа Пін і рэктар БДУ Андрэй Кароль. Усе пагадненні прадугледжваюць садзейнічанне ў арганізацыі абмену навуковай інфармацыяй і студэнтамі, працу над сумеснымі адукацыйнымі і даследчымі праектамі, а таксама інфармаванне аб праграмах навучання, правядзенне навукова-адукацыйных мерапрыемстваў і іншае.

Завераны пакет дакументаў уключае ініцыятыву аб кітайска-беларускім супрацоўніцтве ў галіне фундаментальных навуковых даследаванняў. Дамова прадугледжвае стварэнне Кітайска-беларускага цэнтра фундаментальных навуковых даследаванняў і разглядае магчымасці развіцця вядучымі ўніверсітэтамі дзвюх краін на чале з БДУ і Пекінскім універсітэтам кантактаў па шэрагу напрамкаў. Сярод іх – рэалізацыя навуковых праектаў і работ у галіне матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі і медыцыны; узаемныя візіты студэнтаў, выкладчыкаў і навукоўцаў для забеспячэння абмену ведамі і вопытам; доступ да лічбавых адукацыйных рэсурсаў адзін аднаго; арганізацыя сумесных вытворчых практык, сімпозіумаў, круглых сталоў, канферэнцый і інш. На палях форуму таксама падпісана пагадненне аб абмене навучэнцамі БДУ і Пекінскага ўніверсітэта.

Знакавым стала падпісанне мемарандума аб заснаванні **Дзён дружбы і адзінства БДУ і Пекінскага ўніверсітэта.** Мяркуецца, што свята стане штогадовай падзеяй і будзе традыцыйна праводзіцца 25 і 26 чэрвеня. Гэта рашэнне накіравана на ўмацаванне гістарычных сувязяў і традыцый, развіццё міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва ў галіне адукацыйных і навукова-даследчых адносін. Тэматычную праграму Дзён дружбы плануюць у будучыні напоўніць сустрэчамі кіраўніцтва дзвюх УВА і іх факультэтаў, на-

*Працяг на старонцы 2*

Універсітэт
24 ліпеня 2024 года, № 7 (2285)



*Працяг. Пачатак на стар. 1*

вуковымі мерапрыемствамі, форумамі і дыялогавымі пляцоўкамі для абмеркавання вынікаў шматгадовай сумеснай працы і вызначэння будучых вектараў развіцця партнёрскіх адносін.

Па словах міністра адукацыі Беларусі Андрэя Іванца, ініцыятыва аб заснаванні Дзён дружбы і адзінства БДУ і ПКУ і аб супрацоўніцтве ў галіне фундаментальных навуковых даследаванняў з'яўляецца паслядоўным і лагічным працягам актыўнага дыялогу паміж установамі вышэйшай адукацыі дзвюх краін.

– Ва ўмовах сур'ёзных выклікаў сучаснасці мы як ніколі разумеем важнасць рэалізацыі адзіных падыходаў да пытання ўмацавання навуковага супрацоўніцтва, моладзевай палітыкі і ўдасканалення працэсу падрыхтоўкі кадраў з улікам патрэб нацыянальных эканомік дзвюх краін, – адзначыў міністр. – Сфера адукацыі з'яўляецца тым падмуркам, які забяспечвае развіццё кантактаў паміж нашымі навукоўцамі, моладдзю і паказвае высокі ўзровень даверу паміж нашымі народамі, а самае галоўнае – трывалай асновай двухбаковых адносін для будучых пакаленняў.

Сакратар партыйнага камітэта ПКУ Хаа Пін адзначыў, што ў БДУ вялікая ўвага надаецца развіццю фундаментальных навуковых даследаванняў, у тым ліку сумесных з кітайскімі партнёрамі. Ён акцэнтаваў увагу на стварэнні Беларуска-кітайскага цэнтра ў галіне прыродазнаўчага профілю, рэалізацыі на яго базе сумесных адукацыйных праграм і ініцыятыў. Таксама Хаа Пін выказаў спадзяванне, што заснаванае свята дазволіць актывізаваць супрацоўніцтва ў галіне абмену студэнтамі, будзе спрыяць развіццю практык летніх школ, навуковых праектаў.

– Мы – браты, таму павінны разам рухацца і развівацца, – падкрэсліў Хаа Пін.

У сваім звароце да ўдзельнікаў мерапрыемства рэктар БДУ Андрэй Кароль назваў візіт дэлегацыі Пекінскага ўніверсітэта на чале з сакратаром партыйнага камітэта Хаа Пінам у Беларусь сапраўды гістарычным і важным для нашай краіны, паколькі адзначаецца высокая агульнасць поглядаў на далейшае развіццё адукацыі, навукі і супрацоўніцтва дзвюх краін у гэтых напрамках. Таму, са слоў рэктара, дзве вядучыя УВА Беларусі і Кітая выступілі ініцыятарамі заснавання Дзён дружбы і адзінства, што стане дэманстрацыяй эфектыўнага і надзейнага ўзаемадзеяння па розных вектарах, уключаючы далучэнне студэнтаў і выкладчыкаў да розных навукова-адукацыйных, культурных абменных працэсаў. Адным з першых і вельмі адказных сумесных мерапрыемстваў у межах свята рэктар БДУ назваў Форум рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі і Кітая.

– БДУ прымае рэкордную колькасць дэлегацый вядучых універсітэтаў Кітая. Вядома, для нас гэта вялікая адказнасць, але і вялікі гонар, бо нават тыя дамоўленасці, якія прагучалі на сустрэчы кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі і нашых кітайскіх партнёраў, стануць асновай далейшага прынцыпова новага развіцця ўжо не ў вузкіх лакальных напрамках. Мы рухаемся да будаўніцтва «вялікіх мастоў», якія будуць аб'ядноўваць універсітэты нашых краін і спрыяць папулярызацыі навуковых даследаванняў, адзінай моладзевай палітыцы, – рэзюмаваў Андрэй Кароль.



Акрамя таго, кіраўнік УВА адзначыў эфектыўную работу, якая ўжо склалася, і высокую дынаміку руху беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі. І пацвярджэннем гэтаму з'яўляецца гісторыя супрацоўніцтва БДУ з кітайскімі універсітэтамі. У прыватнасці, са слоў кіраўніка УВА, у БДУ рэалізуецца 112 дамоў і пагадненняў з 73 універсітэтамі і навуковымі цэнтрамі Кітая. У структуры БДУ працуе Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя, створаны два сумесныя інстытуты з Далянскім політэхнічным універсітэтам, а таксама ў мінулым годзе на базе ФМА быў адкрыты даследчы цэнтр ШАС.

– На цяперашні момант на розных факультэтах БДУ вучыцца 3,5 тысячы кітайскіх студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, што складае каля 70 % ад усіх замежнікаў БДУ, – падзяліўся Андрэй Кароль. Таксама сярод асноўных дасягненняў супрацоўніцтва рэктар назваў адкрыццё ўніверсітэцкай сеткі навукова-даследчага супрацоўніцтва (iUNRC, Кітай), адным з заснавальнікаў якой з'яўляецца БДУ.

Напрыканцы кіраўнік УВА выказаў спадзяванне на тое, што партнёрскае ўзаемадзеянне стане яшчэ больш цесным і ўзаемакарысным, а далейшая выніковая работа ўмацуе двухбаковае беларуска-кітайскае супрацоўніцтва.

Таксама падчас візіту адбылася **сустрэча Андрэя Караля і прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі Беларусі з намеснікам міністра адукацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі Чэнь Цзэ**, які высока ацаніў узровень адукацыі і навукі ў БДУ. Гасцям былі прапанаваны тры асноўныя напрамкі супрацоўніцтва: сумесная падрыхтоўка высакакваліфікаваных спецыялістаў, правядзенне навуковых даследаванняў па пытаннях вырашэння глабальных сусветных праблем і двухбаковы абмен студэнтамі, магістрантамі і аспірантамі. Намеснік міністра адукацыі КНР для ўмацавання навукова-даследчага супрацоўніцтва і развіцця навуковага патэнцыялу запрасіў БДУ стаць членам кітайскай Асацыяцыі па лічбавай адукацыі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## НАВІНЫ

Беларусь наведалі першыя лэдзі Зімбабвэ і Нігерыі Аксілія Мнангагва і Алурэмі Цінубу

У краіне адкрыта больш за 139 тыс. дэпазітных рахункаў па праграме «Сямейны капітал»

Урачыстая цырымонія адкрыцця «Славянскага базару» прайшла ў Віцебску

МУС Беларусі і Расіі ўзгаднілі падыходы ў міграцыйнай палітыцы

Плыўчыха Ганна Пятруцкая ўзяла бронзу першынства Расіі з юніёрскім рэкордам Беларусі

Звесткі пра помнікі Вялікай Айчыннай вайны актуалізавалі на кадастравай карце Беларусі

У Брэсце прайшоў Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа»

Беларусь і Расія абмеркавалі сумесныя імпартазамяшчальныя праекты ў прамысловасці

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей»

Кіраўнікі МЗС Беларусі і Кітая правялі перамовы ў Пекіне

У рэгіянальныя УВА Беларусі залічаны 375 пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд

Кідальніца молата Настасся Маслава перамагла на Кубку Расіі

Маштабную экспазіцыю Made in Belarus прадставілі на выставе «ІНАПРАМ» у Екацярынбургу

У Беларусі прайшоў прэс-тур для прадстаўнікоў СМІ краін ШАС

Батутыст Іван Літвіновіч стаў першым на этапе Кубка свету ў Партугаліі

Свята «Купалле» ў Александрыі наведалі больш за 96 тыс. гасцей




# СПЛЯЦЕННЕ ТВОРЧАСЦІ – СПЛЯЦЕННЕ КУЛЬТУР

Каля 90 артыстаў з Пекінскага ўніверсітэта сталі гасцямі БДУ. 25 і 26 чэрвеня на сцэне Цэнтральнага Дома афіцэраў прайшлі канцэрты, якія адзначылі візіт кітайскай дэлегацыі ў Беларусь і стварэнне Дзён дружбы і адзінства БДУ і ПКУ (Пекінскага ўніверсітэта). У гэтыя вечары творчыя калектывы ВНУ стварылі сапраўдную палітру з нацыянальнай музыкі і танцаў дзвюх культур.

Студэнцкі творчы калектыў ПКУ вядомы з 1916 года. На сёння ён уключае ў сябе ансамбль народных інструментаў, сімфанічны аркестр, танцавальную групу і хор, якія сабраў больш за 400 студэнтаў з самых розных факультэтаў.

Сцэну з калегамі з Паднябеснай падзялілі харавая студэнцкая капэла, аркестр народных інструментаў і ансамбль танца «Крыжачок». Вядучыя вялі канцэрт адразу на дзвюх мовах, расказваючы гісторыі кожнага творчага нумара.

Першае аддзяленне прайшло пад назвай «Зоркі і месяц спяваюць ва ўнісон». У ім студэнцкі ансамбль народных інструментаў Пекінскага ўніверсітэта выканаў некалькі нацыянальных твораў. Прагучала музыка, якая адлюстроўвае каларыт і ўсё багацце культуры Кітая. «Святочная ўверцюра», «Скачок дракона і скачок тыгра» і старажытная народная песня «Жасмін», якая стала цытатай у знакамітым творы Джакама Пучыні «Турандот». Гледачы пачулі старадаўні сямістурнны музычны інструмент гуцінь, флейты, гонгі, барабаны, двухструнную кітайскую скрыпку – эрху.





Наш універсітэт прывітаў гасцей харэаграфічнай кампазіцыяй «Мора сустракае» на матывы матроскага танца «Яблычак» ад народнага ансамбля танца «Крыжачок» і беларускай песняй «Ой, рана на Івана» ад студэнцкай харавой капэлы.

Пазнаёмілі публіку і з сучасным кітайскім мастацтвам. Выканаўцы спявалі пра сваю любоў да радзімы, надзею на светлую будучыню. Каб зразумець гэта, не патрэбны быў перакладчык. На відэароліку, які суправаджаў песню «Кітай, заліты святлом», студэнты Пекінскага ўніверсітэта наведваюць свае заняткі, абменьваюцца ідэямі, займаюцца спортам. Паказваюць, як кітайская моладзь імкнецца да высокіх стандартаў і поспехаў, не забывае атрымліваць асалоду ад свайго юнацтва. Гэта песня плаўна падвяла гледачоў да другога аддзялення канцэрта, якое называлася «Ода юнацтву».

У ім прагучала некалькі знакамітых рамантычных твораў. У іх ліку «Вальс» і «Раманс» з сюіты «Завеі» ў выкананні аркестра БДУ. А артысты з Пекінскага ўніверсітэта прадэманстравалі музычна-харэаграфічны паказ на знакамітую трагедыю «Лян Шаньбо і Чжу Інтай» і класічны танец з вадзянымі рукавамі, мячом і папяровым веерам «Рытм і мелодыя вады». Таксама госці нашай краіны здзівілі публіку выкананнем вядомай усім беларусам песні «Алеся».

– Было цікава пазнаёміцца з культурай іншай краіны праз творчасць студэнтаў, – дзеляцца ўражаннем гледачы. – Тое, з якім майстэрствам выступалі выканаўцы, паказвае, як яны шануюць і паважаюць сваю культуру і традыцыі. У зале прысутнічала шмат студэнтаў з Кітая, і было бачна, што яны таксама рады быццам аказацца на Радзіме, хоць і ненадоўга.

Завяршыўся канцэрт сумесным беларускакітайскім выкананнем песні «Купалінка» і тэматычнага твора «You and Me», прысвечанага алімпіядзе ў Пекіне 2008 года. «Я і ты з аднаго свету», – гучыць у песні.

Святкаванне Дзён дружбы і адзінства павінна ўмацаваць сувязь з Пекінскім універсітэтам. Плануецца, што гэта імпрэза стане традыцыйнай і будзе праводзіцца штогод. Тэматычная праграма напоўніцца сустрэчамі кіраўніцтва дзвюх ВНУ і іх факультэтаў, навуковымі мерапрыемствамі, форумамі і дыялогавымі пляцоўкамі.

**Ганна КАЗАКОВА**

УНІВЕРСІТЭТ
24 ліпеня 2024 года, № 7 (2285)

# ІНА ГУЛІС: УСЮДЫ, ДЗЕ ЁСЦЬ СІСТЭМА «ЧАЛАВЕК – ЧАЛАВЕК», ЁСЦЬ МЕСЦА ДЛЯ ПРАЦЫ ПСІХОЛАГА

**Іна Гуліс – кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, дзейны гештальт-тэрапеўт, арганізацыйны псіхолаг, бізнес-трэнер, адзін з першых у Беларусі спецыялістаў-коўчаў, сертыфікаваных у Міжнароднай акадэміі коўчынгу (ICF). Тыя, хто знаёмы з выкладчыцай, ведаюць, як лёгка ў ёй спалучаюцца розныя якасці: з аднаго боку, Іна шчырая, адкрытая, вясёлая, прастадушная, а з другога – строгая, дзелавая, рашучая і прынцыповая. І пры ўсёй палярнасці педагог, якая ў будучым годзе адзначыць 20-годдзе працы ў БДУ, імкнецца быць цэласнай, застаючыся сабой. Невыпадкова ад яе нярэдка можна пачуць фразу: «Мне цікава жыць!»**



У першыню з Інай Гуліс мы пазнаёміліся на курсах павышэння кваліфікацыі. За лічаныя хвіліны выкладчык псіхалогіі авалодала ўвагай 30 слухачоў. А пасля шэрагу пар, што праходзілі як дыялогі і інтэрактыўныя гульні, увайшла ў топ лектараў, адзначаных удзельнікамі пасля завяршэння навучання. Сакрэт, як выявілася, хаваецца ў шматгадовай практыцы.

– Кожная новая група, куды я прыходжу – новы мікрасвет, які цікава спасцігнуць. Канешне, ёсць сацыяльна-псіхалагічныя заканамернасці паводзін, веданне якіх падтрымлівае мяне падчас узаемадзеяння. Але самае важнае ў гэтым працэсе – весці дыялог і даносіць інфармацыю ў форме адкрыццяў, зробленых самімі слухачамі. Ведаю дакладна: без інтарэсу аўдыторыі працаваць немагчыма. Таму часта прапаную эксперыментаваць і разам знаходзіць адказы на важныя пытанні, – дзеліцца гераіня.

Па словах Іны Гуліс, на яе прафесійнае станаўленне паўплываў Міхаіл Яноўскі – выкладчык, які працаваў у БДУ, а пасля заснаваў кафедру псіхалогіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Па першай спецыяльнасці Іна – рэжысёр, але з гэтым напрамкам яна была звязана нядоўга: чым больш працавала з людзьмі, тым больш разумела, што ёй не хапае глыбокіх ведаў пра чалавека. Так, паступова ўнутры саспела жаданне стаць псіхолагам. І, як аказалася, ідэя ператварылася ў захапляльнае падарожжа!

– Калі я паступіла на ФФСН, мне было 29 гадоў. Паколькі ў той час завочнага аддзялення па псіхалогіі ў БДУ не існавала, я вучылася вочна. Узрост дазволіў усвядомлена падыходзіць да вывучэння прафесійных дысцыплін і пры гэтым выбудоўваць добразычлівыя адносіны на роўных з аднакурснікамі, значна маладзейшымі за мяне. Думаю, у нейкай ступені такі ж фармат узаемадзеяння можна назіраць зараз у маёй выкладчыцкай дзейнасці, – адзначае спецыяліст.

За час вучобы Іна Гуліс зацікавілася адвольнай самарэгуляцыяй паводзін, затым – паводзінамі ў сітуацыі фрустрацыі кіраўнікоў. А пасля, з лёгкай падачы свайго навуковага кіраўніка – прафесара Ігара Фурманава, пачала вывучаць агрэсію ў сітуацыі фрустрацыі. Гэты інтарэс таксама падтрымліваўся тым, што ў студэнткі ўжо быў вопыт працы ў арганізацыі, а яе муж пачынаў кіраваць уласным прадпрыемствам. Затым навуковыя пошукі выліліся ў кандыдацкую дысертацыю «Асобасныя і сітуацыйныя фактары агрэсіі ў службовых адносінах», якую Іна абараніла ў 2014 годзе.



– Дарослы чалавек значную частку свайго часу праводзіць на працы. І, як сацыяльная істота, выбудоўвае дзелавыя камунікатыўныя сеткі. У зносінах з калегамі вырашаюцца арганізацыйныя задачы, і праз рэфлексію мы атрымліваем веды пра сябе. Пазітыўная інфармацыя ўбудоўваецца ў сістэму нашага вобраза-Я і спрыяе псіхалагічнаму дабрабыту, уплывае на паводзіны. Паводзіны аднаго ўдзельніка групы з рознай сілай уплываюць на іншых і, адпаведна, уздзейнічаюць на эфектыўнасць групы ў цэлым. А група, у сваю чаргу, з'яўляецца асяроддзем для рэалізацыі асабістай эфектыўнасці, – тлумачыць выкладчык.

Псіхолаг прызнаецца, што ў прафесіі ёй шанцавала з педагогамі, бо кожнага з іх можна назваць чалавекам-легендай. Усе яны вучылі Іну думаць, адчуваць і рабіць выклікі сабе. Многія з гэтых людзей і зараз працуюць на кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі.

Іна Гуліс лічыць сябе патрабавальным выкладчыкам: псіхолаг імкнецца, каб студэнты пасля сустрэчы з ёй мелі пэўны ўзровень ведаў, таму строга ставіцца да дакладнасці і якасці выкананых работ, часу іх здачы. Разам з тым яна стараецца падтрымліваць пачынанні студэнтаў, адгукаецца на іх просьбы:

– Я строгая і крытычная да сябе-выкладчыка і бачу сваю асноўную задачу ў тым, каб заражаць навучэнцаў інтарэсам. У такім выпадку яны самі без праблем выконваюць любую работу. Ад ідэі проста навучыць я іду да ідэі стварыць умовы, каб яны вучыліся, – разважае спецыяліст.

У размове мы таксама закранаем праблему неабходнасці прафесійнай адукацыі ў час узрастання сусветнай папулярнасці псіхалогіі. Па словах выкладчыка, сёння побач з прафесіяналамі з'яўляюцца харызматычныя «гуру», якія з усіх даступных ім крыніц вядуць аповед пра магчымыя заробкі псіхолагаў, апускаючы фокус з іх рэальнай працы. Таму некаторыя абітурыенты хочуць як мага хутчэй атрымаць асновы для пачатку ўласнай практыкі:

– З поля зроку сыходзіць разуменне таго, што ўніверсітэт дае базавую псіхалагічную адукацыю, якая патрабуе дадатковай спецыялізацыі пасля яго заканчэння. Калі-нікалі абітурыентам цяжка зразумець, што студэнту, які атрымаў, да прыкладу, спецыялізацыю па сацыяльнай ці арганізацыйнай псіхалогіі, адкрываецца больш магчымасцяў у прафесійнай рэалізацыі: пачынаючы ад працы ў арганізацыях рознага профілю,заканчваючы падрыхтоўкай да адкрыцця сваёй практыкі. Усюды, дзе ёсць сістэма «чалавек – чалавек», ёсць месца для працы псіхолага.

Праз спецыфіку дзейнасці Іне часта прыходзіцца даваць парады. Аднак і прымаць іх яна ніколі не супраць. Найбольш каштоўнымі для сябе псіхолаг лічыць дзве: параду ў адносінах да часу – «Festina lente» (спяшайся павольна) і фразу «Ты можаш усё, што захочаш, ці амаль усё». Галоўнае толькі, абапіраючыся на іх, разабрацца ва ўласных жаданнях.

– Чалавек становіцца паспяховым у той момант, калі хоча гэтага. Хацець і рабіць – вось ключ да таго, каб рухацца наперад, – падводзіць вынік Іна Гуліс.

**Ірына ІВАШКА**

# АЛЯКСЕЙ БАКАВЕЦ: АД НАВУКІ ДА ВЫКЛАДАННЯ



**Аляксей Бакавец – аспірант і старшы выкладчык кафедры электрахіміі. Яму 27 гадоў, і сваю кар'еру ва ўніверсітэце ён распачаў не так даўно. Але Аляксей паспеў распрацаваць электронныя навуковыя праграмы, удзельнічаў у міжнародных праектах, рыхтаваў школьнікаў да алімпіяд і абараніў кандыдацкую дысертацыю. Цяпер жа ўвесь яго час прысвечаны выкладанню. І гэта не застаецца незаўважаным. Выкладчык працуе на хімічным факультэце толькі год, але ўжо атрымаў ад сваіх студэнтаў добры водгук. У канцы семестра навучэнцы адзначылі яго працу на 9 з паловай балаў.**

**Наш герой расказаў пра сябе падрабязней і падзяліўся падыходам, які дазволіў яму выкладаць цікава і з задавальненнем для сябе і студэнтаў.**

## КРОКІ Ў НАВУЦЫ

У дзяцінстве Аляксей пра прыродазнаўчыя навукі не задумваўся. Ён планаваў пайсці па шляху маці і стаць гісторыкам. Калі ў школе пачалася хімія, праблемы былі ў самых элементарных заданнях, і палепшыў свае веды тады, калі перайшоў у іншую школу. Але хлопец не толькі дагнаў аднакласнікаў, але і пакрочыў далёка наперад. Пасля чаго нават удзельнічаў у алімпіядах.

На хімічны факультэт Аляксей паступіў у 2014 годзе. Інтэнсіўна займацца навукай ён пачаў на другім курсе. Яму спадабалася фізічная хімія, у якой упор робіцца больш на разлікі, чым на практычную дзейнасць. Таму сваёй галоўнай тэмай падчас вучобы ён абраў электрахімію.

*– Вельмі радуе, калі ў канцы аспірантуры пішаш навуковую працу і знаходзіш свае даследаванні за 2016 год, якія можаш выкарыстоўваць зараз. Тады разумееш, што вучыўся недарма.*

Нядаўна Аляксей абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Электрахімія нанаструктур на аснове тэлурыду вісмуту». У рабоце навуковец вылучыў два напрамкі: тэрмаэлектрычныя пераўтваральнікі і эругасныя хімічныя крыніцы току.

*– Тэрмаэлектрычныя пераўтваральнікі – рэчывы, якія пры праходжанні электрычнага току могуць ствараць тэмпературную рознасць. Або наадварот, з-за тэмпературнай рознасці ствараюць электрычны ток. Гэта карысна, калі дзесьці ёсць цеплавая энергія і калі яна рассейваецца. Тады з дапамогай тэрмаэлектрычных пераўтваральнікаў з яе можна браць дадатковую электраэнергію.*

Другі напрамак – хімічныя крыніцы току – другасныя батарэі, якія можна перазарадзіць.

*– Цяпер у акумулятарах, напрыклад, тэлефона выкарыстоўваецца літый. На жаль, гэта дарагое рэчыва, і яго ўсё менш і менш у зямной кары. Таму існуюць кірункі, у якіх спрабуюць замяніць літый на цынк ці іншы матэрыял. Такія крыніцы току ўжо будуць цынк-іонныя, а не літый-іонныя. Аднак акумулятар не складаецца толькі з цынку ці літыю. Унутры акумулятара ёсць і іншыя хімічныя рэчывы, якія рэагуюць з іонамі металу і забяспечваюць запасанне электрычнай энергіі. Тэлурыд вісмуту і з'яўляецца патэнцыйным кандыдатам на ролю такога рэчыва ў цынк-іонных акумулятарах.*



У лабараторыі навуковец збіраў такія акумулятары. З прычыны абмежаванасці вады як электраліту напружанне ў іх невялікае, але яны дастаткова стабільныя і лёгка ствараюцца.

Аднак практычнае прымяненне даследаванняў не галоўная мэта Аляксея. Ёй намагаўся вывесці фундаментальныя заканамернасці, растлумачыць іх, спрагназаваць, стварыць метады атрымання новых матэрыялаў.

*– Як сказаў мой навуковы кіраўнік, мы не даём рыбу – мы даём вуду. Галоўнае не вынік і тэхналагічны працэс, а даследаванні, якімі ў будучыні змогуць скарыстацца іншыя навукоўцы.*

Са сваёй тэмай Аляксей удзельнічаў у праграме Еўрапейскага саюза па развіцці навуковых даследаванняў і тэхналогій Horizon 2020. З калегамі з Літвы, Малдовы і ЗША хімік распрацоўваў новыя матэрыялы, карыстаўся навуковай базай праграмы, дзякуючы чаму пашырыў веды.



## ПРАЦА СА СТУДЭНТАМІ

Выкладаць хімік пачаў год таму, калі загадчык кафедры прапанаваў яму праводзіць семінары і лабараторныя работы. Тады Аляксей яшчэ не ведаў, наколькі яго зацягне выкладчыцкая дзейнасць.

Аспірант жартуе, што любіць ствараць сабе дадатковую працу, таму вырашыў сам дэталёва разабрацца ў тэме, прадумаць ход заняткаў, скласці заданні. Досвед у гэтым у яго быў. Раней Аляксей працаваў у ЕРАМ, распрацоўваў электронныя адукацыйныя праграмы, стварыў практыкаванні да навучальных дапаможнікаў па хіміі.

*– На нашай адукацыйнай платформе Moodle таксама ёсць магчымасць ствараць заданні. І я прапанаваў комплекс па электрахіміі, дзе было шмат разнастайных алгарытмізаваных практыкаванняў, для якіх няма адказаў у вольным доступе. Гэта дапамагае студэнтам рыхтавацца да кантрольных работ. Яны могуць на камп'ютары вырашыць задачы і адразу атрымаць водгук. Паўтарыць гэта можна некалькі разоў.*

Праз нейкі час Аляксею прапанавалі паўдзельнічаць у журы навукова-практычнай канферэнцыі для школьнікаў. Пачаліся зборы для падрыхтоўкі дзяцей да міжнародных алімпіяд.

*– Алімпіяднікі – гэта вельмі разумныя і патрабавальныя дзеці. Займацца з імі цікава. Нельга проста нешта раздрукаваць са зборніка, трэба падысці творча. Памятаю, як адно заданне рыхтаваў 5 дзён!*

Год выкладчыцкай дзейнасці аказаўся насычаным. І спыняцца Аляксей не плануе. Яму падабаецца браць новыя праекты, пісаць навуковыя дапаможнікі. Перад тым, як пачаць працаваць над заняткамі, выкладчык заўсёды аналізуе свой падыход да студэнтаў.

*– На лекцыі мы абмяркоўваем толькі тэорыю. Падчас лабараторнай работы спрабуем нешта рабіць самі, а на семінары падлічыць вынікі. Не проста запісваць формулы, а на камп'ютары лікава змадэляваць тое, што ў нас было на практычных занятках.*

Аспірант прызнаецца, што першы семінар, які ён праводзіў з такім падыходам, прайшоў нялёгка. Але гэта вопыт, бо пры падрыхтоўцы да заняткаў Аляксей і сам навучаецца. Пачынае разбірацца ў тым, што раней не патрабавала такіх дэталёвых ведаў. На наступны раз выкладчык прыйшоў ужо з раздаткавымі матэрыяламі. Такі падыход стаў вельмі прадуктыўным. Студэнты пачалі бачыць, што тэорыя не проста стаіць побач з практыкай, але і добра яе апісвае.

## ПЛАНЫ НА БУДУЧЫНЮ

Аспірант плануе пашырыць спектр камп'ютарных праграм метадам матэматычнай апрацоўкі і мадэлявання на сваіх занятках. Ён лічыць, што гэта можна зрабіць, укараніўшы вывучэнне асноў мовы праграмавання.

*– Гэта простыя рэчы, якія могуць дапамагчы і пабудаваць графік і нешта палічыць. Галоўнае – зразумець сутнасць і структуру самой мовы праграмавання, – разважае Аляксей. – Хацелася бданесці, што студэнты нават могуць напісаць простую праграму ў Python, каб падлічыць вынікі сваёй курсавой або змадэляваць якую-небудзь рэч, вырашыць матрычнае або дыферэнцыяльнае ўраўненне. Такі падыход карысны для матэматыкі і мадэлявання хімічных працэсаў. Я лічу, тады б намнога пашырыўся спектр заданняў, якія я мог бы даць па тэарэтычнай электрахіміі.*

Гэтым Аляксей і плануе займацца – даваць навучэнцам заданні, тэмы для курсавых, падаграваць цікавасць да навукі незвычайнымі і сучаснымі падыходамі.

*– Рэалізоўвацца ў БДУ мне падабаецца. На кафедры я нарэшце пачаў адчуваць сябе на сваім месцы. Па-ранейшаму поўнасцю прысвячаць сябе навуковай дзейнасці не атрымліваецца. Але ў гэтым і харaство быць выкладчыкам. Праца са студэнтамі дазваляе прасоўваць у свет свае ідэі і перадаваць іх наступнаму пакаленню.*

**Ганна КАЗАКОВА**

УНІВЕРСІТЭТ
24 ліпеня 2024 года, № 7 (2285)

# АЛЯКСЕЙ ФУРСА: АД ЧЭМПІЁНАЎ БЕЛАРУСІ ДА ПРАДСТАЎНІКОЎ ЗАМЕЖНЫХ ЧЭМПІЯНАТАЎ

**Аляксей Фурса адказвае за футбол ва ўніверсітэце ўжо некалькі гадоў. Ён атрымаў ліцэнзію УЕФА катэгорыі «А» і выпусціў не адно пакаленне топавых гульцоў. Аляксей распавёў пра найлепшых футбалістаў універсітэта, а таксама пра мэты ФК «БДУ» ў гэтым відзе спорту.**



**Раскажыце пра сябе. Як пачалася ваша спартыўная кар’ера?**
Футболам я пачаў займацца ў даволі дарослым узросце, дзесьці ў 12 гадоў. Першыя трэніроўкі праходзілі на легендарным полі СДЮШАР № 3. Тым самым знакамітым полі з асфальтавым пакрыццём, на якім выраслі такія зоркі беларускага футбола, як Валянцін Бялькевіч, Аляксандр Хацкевіч і Аляксандр Глеб. Затым я выступаў за ФК «Мінск», пасля пагуляў за «Ашмяны-БДУФК» і «Крумкачоў».

**Чаму так адносна рана скончылі кар’еру гульца – у 22 гады?**
На гэта ёсць шэраг прычын. Па-першае, ва ўзросце, калі павінен адбывацца пераход з дзіцячага футбола ў дарослы, пачаліся траўмы – я перанёс аперацыю на калене. Па-другое, усведамляў, што ёсць пэўная столь: узровень, вышэй за які, як футбаліст, забрацца не змагу. Па-трэцяе, калі я скончыў БДУФК, мне прапанавалі застацца ў клубе «Ашмяны-БДУФК» у якасці памочніка галоўнага трэнера. Узважыўшы ўсе за і супраць, прыняў рашэнне, што варта паспрабаваць сябе ў гэтай ролі.

**Які самы памятны момант з вашай кар’еры гульца?**
У «Ашмянах» быў добры калектыў. Мы занялі пятае месца ў другой лізе, дамагліся права павышэння ў класе. У «Крумкачах» было цікава. Каманда існавала першы год. Я ішоў туды, каб гуляць у футбол і атрымліваць гульнявую практыку. У выніку мы заваявалі бронзавыя медалі і прайшлі ў першую лігу. Атрымліваецца, два гады – два паспяховыя сезоны.

**У 2017 годзе вы сталі выкладчыкам у БДУ. Як прыйшлі да такога варыянту?**
Усю сваю гульнявую кар’еру я паралельна дзесьці працаваў і вучыўся. Аднойчы пазнаёміўся з Віталём Васільевічам Валасюком. На той момант ён кіраваў у БДУ ўніверсітэцкімі футбольнымі і міні-футбольнымі зборнымі. Разам ён і прапанаваў перайсці ў ФК «БДУ» – я пагадзіўся. Зараз за футбол у нашым універсітэце адказваюць тры чалавекі: Віталь Валасюк, Дзяніс Тропін і я. Я ўзначальваю жаночую зборную ВНУ па вялікім футболе, трэнірую каманду БДУ, якая гуляе ў другой лізе. За міні-футбол адказвае Віталь Васільевіч. Зона адказнасці Дзяніса Андрэевіча – падрыхтоўка мужчынскай зборнай па футболе да ўніверсіяды.

**Раскажыце пра вашу трэнерскую ліцэнзію.**
На дадзены момант у мяне ліцэнзія УЕФА катэгорыі «А». У Беларусі навучаннем трэнераў і выдачай ліцэнзій займаецца АБФФ (Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола»). Існуюць катэгорыі «D», «C», «B», «A» і «Pro». Студэнты і выкладчыкі БДУ маюць магчымасць адвучыцца і атрымаць трэнерскія навыкі і адпаведную ліцэнзію. Зараз я таксама з’яўляюся інструктарам АБФФ. Навучаю людзей на катэгорыі «D» і «C».

**Вы ўжо пяць гадоў за рулём ФК «БДУ». Раскажыце пра гэту каманду.**
Ініцыятарам стварэння клуба быў Віталь Валасюк. Ідэя заключалася ў тым, каб у калектыў уваходзілі студэнты БДУ, а таксама іншыя зацікаўленыя футбалісты. Першапачаткова каманда выступала ў аматарскай лізе Мінска – АЛФ. З 2011 года БДУ прайшоў усе ступені ад базавай лігі да вышэйшай.

З маім прыходам ва ўніверсітэт Віталь перадаў кіраванне камандай мне. Паколькі ў мяне на той момант ужо быў трэнерскі вопыт у другой і першай лізе краіны, з’явілася жаданне паспрабаваць сілы ў спаборніцтвах больш высокага ўзроўню, чым проста аматарскі. Сумесна з Аляксеем Радзюком у 2020 годзе мы ініцыявалі заяўку ФК «БДУ» ў другую лігу Беларусі. Універсітэт падтрымаў нас.

Пры камплектацыі складу стаўка робіцца на студэнтаў БДУ. Часам запрашаем выпускнікоў або абітурыентаў. Штогод у верасні праводзім турнір сярод першакурснікаў. Выступаючы за каманду факультэта, хлопцы маюць магчымасць праявіць сябе і трапіць у каманду ВНУ.

**Каго са сваіх падапечных маглі б вызначыць?**
У БДУ вучацца і вучыліся хлопцы, за плячыма якіх ёсць досвед працы ў вышэйшай лізе, але яны не гулялі за ФК «БДУ». Напрыклад, Андрэй Кудравец – галкіпер маскоўскага «Дынама», наш студэнт. З выпускнікоў адзначыў бы Ілью Лукашэвіча і Мікіту Нікалаевіча з салігорскага «Шахцёра», Ягора Багамольскага, які выступае ў чэмпіянаце Азербайджана, чэмпіёна Глеба Жэрдзева («Дынама-Мінск»), уладальніка бронзавых медалёў вышэйшай лігі Аляксея Лаўрыка («Нёман», Гродна). Усе яны вучыліся ў БДУ і гулялі за зборную ўніверсітэта.

З ФК «БДУ» адзначу брамніка Максіма Азарку, які летась выступаў за «Макслайн», а цяпер – за ФК «Мінск», Дзяніса Хвастовіча («Астравец»), Уладзіміра Маслоўскага («Іслач») і Яўгена Война («Энергетык-БДУ»). У цэлым, у першай лізе ўжо дастаткова футбалістаў, якія прайшлі праз ФК «БДУ».

**У вышэйшай лізе Беларусі ўдзельнічае «Энергетык-БДУ». Ці ёсць у гэтай каманды сувязь з ФК «БДУ»?**
«Энергетык-БДУ» – іншая юрыдычная асоба. Я б вызначыў адносіны нашай каманды з клубам як партнёрскія. Яны дапамагаюць нам са стадыёнам для правядзення матчаў, мы – з месцам для трэніровак дзіцячых каманд. Мы знаходзімся ў пастаянным кантакце з кіраўніцтвам клуба. Дарэчы, дзякуючы гэтым сувязям галкіпер Максім Азарка прыйшоў да нас у арэнду з «Энергетыка», а цяпер выступае ў вышэйшай лізе.

**Якія мэты ставіце перад камандай?**
Наш трэнерскі штаб накіраваны не толькі на падрыхтоўку і развіццё гульцоў як футбалістаў, але і як асоб. Усё ж такі спорт – гэта ўніверсальны інструмент выхавання чалавека. З футбольных задач для БДУ важна заняць першае месца на Рэспубліканскай універсіядзе.

Футбольны клуб «БДУ» таксама акрамя развіцця футбалістаў і дасягнення спартыўных вынікаў дапамагае спецыялістам у розных галінах, запрашаючы іх працаваць з намі. Яскравым прыкладам з’яўляецца наша супрацоўніцтва са студэнтамі факультэта журналістыкі. Сцяпан Вайцяховіч, Мікіта Юхновіч, Ульяна Шлыковіч – гэта людзі, якія прыходзілі да нас на ранніх курсах, дапамагалі з развіццём сацыяльных сетак і маркетынгам. Яны атрымалі досвед, праверылі сілы на практыцы ў сваёй сферы дзейнасці, здабылі навыкі і ўменні, якія дапамогуць ім у будучыні пры працы ў гэтым кірунку.

Хачу звярнуцца да студэнтаў, асабліва журфака. Калі вы хочаце папрацаваць у спартыўнай сферы, паўдзельнічаць у стварэнні кантэнту, прасоўванні старонак каманды ў сацсетках, то ФК «БДУ» будзе рады супрацоўніцтву. Можаце звязацца з намі, напісаўшы ў сацыяльных сетках каманды альбо наўпрост патэлефанаваць мне.

**Ілья ВАРАБ’ЁЎ**

# УНУТРАНАЯ КУХНЯ МАРЫІ СУРЫНАЙ



*Яна лепш за ўсіх ведае, што шлях да сэрца гасцей ляжыць праз страўнік, і ўмее наладзіць працу калектыву такім чынам, каб той функцыянаваў як гадзіннік. Гэтыя словы – невялікія штрыхі да яркага партрэта нашага правадніка па рубрыцы «Працоўны дзень» – загадчыцы вытворчасці сталовай № 7 БДУ Марыі СУРЫНАЙ.*

Сталовая на праспекце Дзяржынскага, 87 адчынена з 9:30 да 16:00. Аднак з паловы на сёмую калектыў ужо на працоўным месцы: трэба падрыхтаваць уласную прадукцыю для буфетаў № 4 і № 6 БДУ.

Перш чым заступіць на змену, апранаю белы халат (тут такія носяць усе) і атрымліваю кароткія ўводныя ад сваёй «напарніцы». Агляд вытворчай гаспадаркі Марыі Сурынай пачынаецца з рампы – пляцоўкі, дзе разгружаюцца тавары, што прывозяць у пункт харчавання. Далей завітваем у цэх гародніны, зазіраем у халадзільныя камеры, накіроўваемся ў гарачы і халодны цэхі, паралельна знаёмімся з усімі супрацоўнікамі.

Пад кіраўніцтвам Марыі Анатольеўны знаходзіцца 8 чалавек: повары Людміла Селівончык, Алена Несцерчык, Валянціна Прыёмка, Галіна Верамей, касір Тамара Петрашкевіч, мыйшчыца посуду Ніна Калініч, а таксама кухонная рабочая Валянціна Глінская і прыбіральшчыца Галіна Жукоўская. Большасць спецыялістаў працуе ў сталовай больш за 12 гадоў, некаторыя ажно 15 – з дня адкрыцця.

Пасля кароткага прадстаўлення выконваем загадчыцкія абавязкі. А іх, трэба сказаць, нямала. Акрамя агульнага кіравання кухняй, Марыі Сурынай трэба замовіць крупы, муку, малочную і мясную прадукцыю, на працягу дня прымаць тавар, правяраць колькасць і якасць прадукцыі, запаўняць суправаджальныя паперы. Таксама загадчыца запаўняе журнал агляду супрацоўнікаў. Перад пачаткам змены яна павінна пракантраляваць самаадчуванне падначаленых і ў выпадку скаргаў адправіць іх да ўрача.

У канцы дня спецыяліст павінна «падбіць» рэшткі прадуктаў, каб затым іх папоўніць, скласці меню на наступны дзень, адправіць яго бухгалтару на разлік цэн, а таксама падрыхтаваць цэннікі для прадукцыі буфетаў. Яшчэ адзін абавязковы і працаёмкі пункт працы – напісанне справаздачы і падрыхтоўка накладных на наступны дзень.

Складанне меню, як мне падалося, адна з самых мудрагелістых задач. Дарэчы, у сталовай яго ствараюць з ухілам на прыблізнае двухтыднёвае меню, якое распрацоўваецца тэхнолагам. Гэта, як аказалася, дазваляе мець у пераліку страў як бюджэтны студэнцкі комплекс, так і больш дарагія варыянты на любы густ.

Марыя Анатольеўна тут жа прыкладна пралічвае, колькі можа каштаваць недарагі студэнцкі абед:

– Салат з морквы – 62 капейкі, боршч з капусты – 97, катлета каштуе 1,42, а каша – 47 капеек. Так, студэнт можа ўкласціся прыблізна ў 3 рублі з паловай. Таксама навучэнцы БДУ могуць атрымаць скідку 10 % на прадукцыю ўласнай вытворчасці. Штодзень у меню, як правіла, заяўлена 6 гарачых страў, 8 халодных закусак, 2-3 гарніры, кампоты і дэсерт. Таксама некалькі разоў на тыдзень гатуем стравы беларускай кухні – у аўторак – дранікі ці калдуны, у чацвер – мачанку з блінамі. У гэтыя дні людзі прыходзяць менавіта на іх.

Запоўніўшы стос папер, загадчыца накіроўваецца да тэлефона:

– Светачка, давайце зробім заяўку, – кажа Марыя Анатольеўна і пачынае зачытваць пералік патрэбных прадуктаў, неабходных сталовай у найбліжэйшы час. Пасля спецыяліст тлумачыць, што бульбу, моркву і цыбулю ў сталовую дастаўляе гродзенская фермерская гаспадарка. Агародніна прыходзіць у пункт харчавання ачышчанай і вакуумаванай, што спрашчае поварам працэс гатавання.

Першы прывоз прадуктаў адбываецца а 10-й гадзіне. Прымаем тавары кандытарскага цэха – хлеб, батоны і булачкі. За некалькі хвілін Марыя Сурына ацэньвае колькасць і якасць вырабаў, звярае накладныя і запаўняе дакументы. Пасля гэтага прадукцыя выстаўляецца на раздачу.

## СТРОГАЯ, АЛЕ СПРАВЯДЛІВАЯ АНАТОЛЬЕЎНА

У кароткія перыяды зацішша прашу сваю суразмоўцу расказаць пра прыход у прафесію. Марыя Анатольеўна кажа, што, хоць у дзяцінстве і марыла быць поварам, але прыйшла да гэтага не напрасткі. Справа ў тым, што тры яе дыпломы звязаны са сферай абслугоўвання: вучылішча яна скончыла ў статусе прадаўца, тэхнікум – як таваразнаўца, а ўніверсітэт – у якасці эканаміста. Кар'еру кіраўнік пачала на пасадзе дырэктара рознічных гандлёвых прадпрыемстваў Пухавіцкага раённага спажывецкага таварыства, затым стала таваразнаўцай баранавіцкай артовай базы. Але толькі пасля другога «дэкрэту» ёй прапанавалі паспрабаваць сябе ў ролі загадчыка вытворчасці школьнай сталовай, адкуль у 2020 годзе яна перайшла ў комплекс БДУ.

– Скажыце, а вы строгі начальнік?

– Так! Вельмі строгі. Мае супрацоўнікі ведаюць, што на працы ўсё павінна быць як трэба. Думаю, вам усе гэта скажуць, але лепей перапытаць у калектыву без маёй прысутнасці, – жартуе загадчыца.

Для чысціні эксперыменту так і раблю. Пераадрасую тое ж пытанне повару Людміле Селівончык:

– Анатольеўна ў нас справядлівая. Яна хоць і строгая, але ніколі не чула, каб яна на некага сварылася. Таму ў нас дружны і зацікаўлены калектыў. Ведалі б вы, як мы радуемся, калі ўсё меню раскупляюць, калі бачым, што ў сталовую прыходзіць шмат людзей. Бывае, госці нешта замаўляюць і кажуць: «Мы па рэкамендацыі: нам сказалі, што ў вас смачна». Канешне, ежа як дома. У нас і на вытворчасці – хірургічны парадак: у сценцы сябе можна ўбачыць, як у люстэрку. А так адбываецца таму, што стараецца кожны.



Марыя Анатольеўна таксама лічыць, што самае дарагое ў яе працы – калектыў. Спецыяліст заўсёды ведае, што патрэбна сваім супрацоўнікам, а яны адчуваюць, што патрэбныя ёй. Таму, па словах Марыі Сурынай, калі ўся каманда кожны выконвае сваю функцыю, і працоўны працэс наладжаны быццам гадзіннік. І, калі нехта ў адпачынку ці на бальнічным, гэта істотна адчуваецца.

## ПРАФЕСІЙНЫЯ ПЯЦЁРКІ

Повары прызнаюцца, што на «дамашні» смак ежы ўва многім уплывае і іх настрой. Таму ў сталовай № 7 БДУ маральны клімат стараюцца падтрымліваць на высокім узроўні пастаянна. Супрацоўнікі кажуць, што заўсёды бачаць, каму ў няпростыя моманты патрэбна пачуць добрае слова, а каму лепей пабыць сам-насам з уласнымі думкамі.

Галоўным сюрпрызам змены для мяне аказалася тое, што повары на вытворчасці атрымліваюць адзнакі. Так-так, зусім як у школе. Спачатку загадчык вытворчасці праводзіць дэгустацыю, ці, як кажуць у сталовай, бракераж, а затым страва атрымлівае адзнаку па пяцібальнай шкале. Затым лічбы пераносяцца ў спецыяльны журнал уліку. Калі гэта 4 і 5 (а так бывае заўсёды) – вынік добры і выраб можна падаваць на стол.

«Калегі» расказалі і тое, што самай энергазатратнай стравай, якую гатуюць у сталовай № 7, з'яўляюцца калдуны. Спачатку трэба нацерці бульбу, адціснуць яе і высмажыць 100 порцый па два ў кожным. І гэта не беручы ў разлік прыгатаванне іншых пазіцый меню. А найбольш запатрабаванай стравай шмат гадоў застаецца курынае філе ў любой варыяцыі – з ананасам, памідорам ці сырам. Некаторыя пакупнікі лічаць, што, калі падчас абеду не з'еў гэту страву, увогуле амаль не паеў.

Кожны дзень сталовая № 7 БДУ прымае ад 300 да 400 наведвальнікаў. Найбольшая плынь гасцей назіраецца з 12 да 14 гадзін і ў перыяд сесій, а найменшая – падчас канікул ці ўлетку. Пастаянных наведвальнікаў супрацоўнікі ведаюць, як добрых знаёмых – памятаюць, у які час яны прыходзяць, і засмучваюцца, калі тых доўга няма. А таксама персанал можа ўгадаць, што замовіць госць.

– Бярэ, напрыклад, чалавек кожны дзень яйка пад маянэзам. І што б ні здарылася, ён не прамяняе яго ні на які салат. Ці падабаецца госцю мачанка – Людміла Васільеўна бачыць яго і запытвае: «Вам мачанку»? Той усміхаецца, ківае. Некаторыя кліенты ходзяць да нас ужо пятнаццаць гадоў, – усміхаецца загадчыца вытворчасці. – У нас няпростая работа, таму адказнасць – самая галоўная якасць людзей, што задзейнічаны ў галіне абслугоўвання. Калі ты ўжо прыйшоў у прафесію, павінен аддаваць усяго сябе, гатаваць як для сваіх родных.

## «МАМА МАЛЮЕ, А ЦІХАН ЗДАЕ»

Па-за працай Марыя Сурына – душа кампаніі, якая любіць актыўны адпачынак сярод сяброў і родных. Невыпадкова ў найбліжэйшых планах загадчыцы вытворчасці канікулы на браслаўскіх азёрах. А яшчэ – абавязковы паход у лес.

– Я грыбнік і ягаднік. Як толькі пачынаецца сезон – нават не выходзіла б з лесу. Стараюся выбірацца туды хаця б на выхадных. Сябры ўжо жартуюць: «Вунь на Камароўцы ўжо лісічкі з'явіліся, пара і табе ў грыбы!» Там зліваешся з прыродай, адпачываеш і не заўважаеш, як прабягае час, – прызнаецца суразмоўца.

Натхненне Марыя Анатольеўна, як і многія, знаходзіць у сям'і: тут заўсёды патрэбна некаму надаць увагу, пагутарыць, дапамагчы з урокамі:

– Дачушка ў мяне старэйшая, і ёй патрэбна менш дапамогі са школьнымі пытаннямі. А вось з сынам мы і вершы вучы, і малюем. Памятаеце, як у песні: «Папа рашае, а Ваня здае»? Так і ў нас: мама малюе, а Ціхан здае. Муж і дзеці – мая галоўная апора.

**Ірына ІВАШКА**

УНІВЕРСІТЭТ
24 ліпеня 2024 года, № 7 (2285)

# РЭСПУБЛІКАНСКІ ЛІТАРАТУРНЫ КОНКУРС «БРАМАМАР» ПРАЙШОЎ У БДУ



В а ўніверсітэце завяршыўся Рэспубліканскі літаратурны конкурс «БрамаМар» імя У. А. Капцава. Сёлета журы выбралі найлепшыя работы з больш чым 120 заяўленых.

Арганізатарам мерапрыемства выступілі выкладчыкі і студэнты факультэта журналістыкі БДУ. У гэтым сезоне таленты шукалі ў пяці намінацыях: «Школьная проза», «Школьная паэзія», «Студэнцкая проза», «Студэнцкая паэзія», а таксама «Сцэнарыі камп’ютарных і настольных ролевых гульняў». Конкурс аб’яднаў моладзь і школьнікаў з розных гарадоў Беларусі.

Фінальнымі актыўнасцямі мерапрыемства стаў майстар-клас пісьменніцы Людмілы Рублеўскай і цырымонія ўручэння дыпломаў. Найлепшымі ў намінацыі «Школьная паэзія» сталі навучэнка Ліцэя БДУ Ангеліна Мацюшонак, а таксама вучаніцы мінскіх



гімназій № 74 и № 35 Аляксандра Шахно і Марыя Сандрозд. Першымі сярод аўтараў школьнай прозы прызнаны навучэнцы Маркаўскай сярэдняй школы Маладзечанскага раёна Ангеліна Ветлава, сярэдняй школы №21 Магілёва Арцём Салікаў і Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Валерыя Гілеўская. Найлепшымі празаікамі назвалі другакурсніцу ФРКТ Марыну Гуцаву, а таксама студэнтак МДЛУ і БДМУ Дар’ю Каладзінскую і Паліну Корневу адпаведна. На п’едэстале намінацыі «Студэнцкая паэзія» замацаваліся прадстаўнікі журфака БДУ (Раман Гадун), БДПУ імя Максіма Танка (Маргарыта Стрыевіч) і БДЭУ (Любава Юркевіч). У топе напрамку «Сцэнарый камп’ютарных і настольных ролевых гульняў», што ў гэтым годзе быў уведзены ўпершыню, прызавыя месцы занялі дзве зборныя другакурсніц факультэта журналістыкі. У склад першай увайшлі Наталля Бурко, Наталля Гарбіна, Паліна Каско, Кацярына Сяйцова і Кацярына Сяржаніна. Другую каманду прадставілі Ілона Бокач, Лізавета Алейнікава, Ксенія Суханосава і Марыя Грыцкевіч. Абодва калектывы распрацавалі настольныя гульні па творах класікаў беларускай літаратуры.

**Ірына ІВАШКА**

## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

### НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ

**Хімічны факультэт БДУ аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры арганічнай хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | 2 гады |
| Дацэнт кафедры аналітычнай хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203, да 22 жніўня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203, да 21 верасня.

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук або навуковае званне прафесара, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

### АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНАЙ ПАСАДЫ

Загадчыка лабараторыі спецыялізаваных вылічальных сістэм па спецыяльнасці 01.04.01 «Прыборы і метады эксперыментальнай фізікі» – 1 адзінка.

Месца (адрас) прыёму заяў для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, каб. 230.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, каб. 230. Тэрмін конкурсу – месяц з дня апублікавання аб’явы. Тэлефон: 270-48-43

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 24.07.2024 г.
Зак. 681. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*